Технология разрабатывается и апробируется Н. В. Романчик в течение 17 лет с целью многостороннего развития личности в контексте традиционных национальных ценностей. В процессе подготовки и проведения психологического спектакля – праздника у участников группы актуализируется чувство привязанности к тем местам, где человек родился и вырос; уважительное отношение к языку своего народа; уважительное отношение к историческому прошлому Родины, своего народа, его обычаям и традициям; гордость за социальные и культурные достижения своей страны. Формирование чувства этнической принадлежности становится наиболее приемлемым способом вновь ощутить себя частью некоего целого, найти психологическую поддержку в традиции. Технология дает возможность обращения и укрепления патриотизма как важнейшей ценности, интегрирующей не только социальный, но и духовный, нравственный, культурный, исторический и другие компоненты.

Стержневая тема Купальского праздника – эта тема рода и национальных традиций, которые в процессе праздника наполняются в сознании его участников глубоким смыслом. Они видят красоту и значимость национальных накоплений, на какое-то время получают возможность посмотреть на мир глазами своих предков, понять, что их заботило и волновало. Обрядовая традиция Купальского праздника – это вольные рамки, позволяющие включить в праздник любые нужные в данный момент группе элементы психологической работы. В этот день можно вспомнить тех, кто был до нас, задуматься о своих корнях, почувствовать силу и поддержку своего рода, поклониться им, а может быть ответить на вопросы: «Кто я? Кем я являюсь на этой земле? Какие родовые послания я воплощаю в своей жизни»?», увидеть себя и продолжение своего рода в будущем. При этом каждое Купалье – это абсолютно оригинальное событие, не похожее на все предыдущие. Начиная с 2003 г., «Купальская ночь» существует как ежегодный проект, в рамках которого разрабатываются разные темы, разрабатывается свой индивидуальный сценарий на основе главной «стержневой» темы тренинга и психологических запросов его участников. Соответственно праздники-спектакли имеют свои оригинальные названия, такие как: "Ноч на Івана Купалу", «Карані і крылы», «Вясельны карагод», «Казка кахання чароуная», «Радавод», «У пошуках папараць-кветкі», «Там душа мая жыве», «Завівайся купальскі вянок», «Радавое дрэва», «Купальская скарбніца», «Вытокі. Датыкненне».

Технология предполагает разрешение внутренних конфликтов участников, что позволяет:

- избавиться от старого и ненужного в жизни (проблем, отношений, чувств, ситуаций) и очистить «внутреннее пространство» для нового и желаемого;
- поработать над следующими вопросами: поиск закономерностей семьи и рода как системы, изменение деструктивных моделей поведения, выявление, исследование и терапия трансгенерационных травм поколений;
- развить навыки общения и эффективного взаимодействия при создании праздника для себя и своей группы, наполняя его глубинным смыслом;
- найти личностные ресурсы, «зоны исцеления».

Время осуществления проекта показывает, что такая форма культурной терапии имеет огромные возможности в решении проблемы формирования этнической идентичности и разрешении внутренних конфликтов участников группы.

### Список использованных источников

1. *Русских, Л. В.* Идентичность: культурная, этническая, национальная / Л. В. Русских // Вест. ЮУрГУ. Серия «Социально-гуманитарные науки». – 2013. – №2. – С. 178–180.

2. *Лебедева, Н. М.* Методы этнической и корсскультурной психологии // А. Н. Татарко, Н. М.Лебедева. – М. : Изд. дом ВШЭ, 2011. – 20 с.

УДК 130.2:821.161.3

## «КАЗКА ЖЫЦЦЯ» ЯК ІДЭАЛ БЕЛАРУСКАЙ ЭКЗІСТЭНЦЫІ

*Т. Ф. Сухоцкая*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь

*«Казка жыцця» разглядаецца як жанравая форма беларускай літаратуры і нацыянальная форма ўтопіі. Каштоўнасны сэнс яе сфарміраваны пад уздзеяннем народнай аксіялогіі. «Казкі жыцця» Якуба Коласа адлюстроўваюць гарманічнае існаванне прыроднага асяроддзя і недасканаласць сацыяльнага і чалавечага быцця. Галоўнай інтэнцыяй утапічнай формы з'яўляецца гарманізацыя прыроднага і чалавечага існавання, сцвярджанне каштоўнаснай сутнасці жыцця, раскрыцця творчага патэнцыялу асобы. Падкрэсліваецца не толькі характво нацыянальнага ідэалу, але і яго дзейсная сіла. Беларуская «казка жыцця» з'яўляецца архетыпнай асновай нацыянальнага менталітэту. Яе разбурэнне і абясцэньванне знайшло адлюстраванне ў антыутопіі.*

*Ключавыя словы: «Казка жыцця», утопія, антыўтопія, экзістэнцыя, архетып.*

## «FAIRY TALE OF LIFE» AS AN IDEAL OF BELARUSIAN EXISTENCE

*T. F. Sukhotskaya*
Belarusian state University of culture and arts, Minsk, Belarus

*«The tale of life» is considered as a genre form of Belarusian literature and a national form of utopia. Value meaning it is formed under the influence of the people's axiology. «Tales of life» by Jakub Kolas reflect the harmonious existence of the natural environment and the imperfection of social and human existence. The main intention of the utopian form is the harmonization of natural and human existence, the assertion of the value essence of life, the disclosure of the creative potential of the individual. It emphasizes not only the charm of the national ideal, but also its effective power. The Belarusian «tale of life» is the archetypal basis of the national mentality. Its destruction and depreciation is reflected in the dystopia.*

*Key words: «Fairy tale of life», utopia, dystopia, existence, archetype.*

Ва ўмовах нарастаючай інтэрнэтызацыі сучаснай культуры, укаранення інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій ва ўсе сферы жыццядзеяння грамадства назіраецца дэструкцыя духоўнай сутнасці чалавека. Сучасная цывілізацыя з яе разбуральнымі тэндэнцыямі абясцэньвання быцця выклікала невядомы раней катастрафічны крызіс асобы і немагчымасць спалучэння рэаліяў эпохі з першапачатковым сэнсам быцця. Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца выяўленне каштоўнасна-маральных прыярытэтаў чалавечай экзістэнцыі, закладзеных ў нацыянальнай утопіі.

Тэарэтычнай асновай даследавання паслужылі ідэі, што знайшлі сваё развіццё ў працах айчынных і замежных літаратуразнаўцаў (З. Мельнікавай, М. Тычыны, А. Яскевіча, І. Афанасьевай, Л. Кораня, Т. Тарасавай), філосафаў і псіхолагаў (Ж.-П. Сартра, А. Маслоу, А. Швейцара, Э. Фрома, М. Крукоўскага), культуролагаў (А. Рагулі, А. Смоліка, І. Марозава), міфолагаў і фальклрыстаў (К. Леві-Страса, У. Тапарова, Т. Шамякінай).

Адметнасць і арыгінальнасць культуры закадзіравана найперш у яе ідэалах. Іх культурныя сэнсы раскрываюць змест нацыянальнай самасвядомасці, адметнасць вырашэння шматлікіх анталагічных праблем: сутнасць зямнога чалавечага існавання, стасункі чалавека з акаляючым асяроддзем, мэту культуратворчасці асобы і г. д. У культуралогіі ідэал разумеюць як найвышэйшую каштоўнасць. Ва ўмовах сацыяльных крызісаў і перыяды трансфармацый грамадства ўзрастае роля ідэалаў як актыўнай арганізуючай сілы ў вырашэнні сацыякультурных праблем праз актывізацыю культуратворчай і грамадскай актыўнасці гістарычнага суб'екта. Адсутнасць дзейсных ідэалаў вядзе да апатыі, абыякавасці і агрэсіі асобы. Падчас крызісных сітуацый сцверджанне ідэалаў можа выступаць гарантам захавання каштоўнасці чалавечага і грамадскага быцця, пазбаўлення адчування яго трагізму і бессэнсоўнасці.

Народныя ідэалы знайшлі адлюстраванне ў фальклоры. Ідэалам беларускай утопіі як ідэальнай канструкцыі ўдасканалення грамадства стала «казка жыцця». Дадзенае азначэнне нацыянальнай утопіі, прапанаванае Якубам Коласам, найбольш выразна падкрэслівае яе спецыфіку, найперш непадабенства да рацыяналістычна ўнармаванай класічнай утопіі, скіраванасць на паэтызацыю чалавечага быцця, магчымасць яе рэальнага здзяйснення: утапічны ідэал можа быць дасягнуты, бо само жыццё і ёсць казка.

Для казак Якуба Коласа ўласціва спалучэнне глыбока рэалістычнага зместу і алегарычнай формы. У іх адлюстравана гарманічнае існаванне прыроднага асяроддзя і недасканаласць сацыяльнага і чалавечага быцця. Развіццё соцыуму можа і павінна рухацца ў гармоніі з прыродай. Экзістэнцыянальны выбар ненатуральнага шляху вядзе да трагічнага канца. Скразной у казках з'яўляецца ідэя адраджэння чалавека, духоўна роўнавялікага самой прыродзе.

Беларуская «казка жыцця» з'яўляецца архетыпнай асновай нацыянальнага менталітэту, арыентаванага на захаванне традыцыйных каштоўнасцей, асуджэнне рэвалюцыянарысцкіх формаў змянення соцыуму. Кансерватыўнасць беларускай утопіі стала ахоўным сродкам ад дэнацыяналізацыі і разбурэння культуры.

Абясцэньванне беларускай «казкі жыцця» знайшло адлюстраванне ў антыўтопіі трагедыйнага гучання, у якой паказваецца разрыў паміж абвешчаным утапічным ідэалам і рэальным яго увасабленннем. Трансфармацыя «абяцанага раю» знайшла глыбокае адлюстраванне ў творчасці А. Мрыя, М. Зарэцкага, В. Быкава, В. Казько, В. Гігевіча. У XXI ст. антыўтопія працягвае быць сродкам дэсакралізацыі сацыяльнай міфалогіі, выкрыцця і асуджэння антыгуманнай рэчаіснасці.

Чалавек заўсёды знаходзіцца ў пэўных адносінах да свету і іншых людзей, і менавіта непазбежнасць у змене яго палажэнняў у адносінах да рэальнасці і называецца «сітуацыяй» у экзістэнцыялізме. Жыццё асобы ў цэлым – гэта «быццё-у-сітуацыі», якая і з'яўляецца спосабам яго існавання ў свеце і аб'ектыўнага ўспрыняцця свайго быцця. Экзістэнцыянальная сітуацыя «на ростанях» у беларускай антыўтопіі, разыходжання маральных і эстэтычных каштоўнасцей з сацыяльнай практыкай скіроўвае чалавека да неабходнасці надаць сэнс свайму жыццю і тварыць сваю духоўнасць праз сітуацыю выбару і вольнага рашэння.

«Памежная сітуацыя» у беларускай антыўтопіі з’яўляецца пускавым механізмам, які дапамагае экзістэнцыі праявіць сябе, актуалізавацца ў дзеяннях і паводзінах чалавека. Яна адкрывае сапраўднае быццё. Жорсткія абставіны ў антыўтопіі падаўляюць асобу, імкнуцца падначаліць яе створанай сітуацыі. У гэтай барацьбе паказваецца нязломнасць чалавечага духу, адстойваецца яго воля да самавыяўлення. Трагічны фінал беларускай антыўтопіі нібы спыняе імгненне і прасвятляе асобу, дае надзею на рэалізацыю «казкі жыцця».

Выразна акрэсліліся антыутапічныя інтэнцыі ў беларускай мастацкай культуры праз сімвалы сучаснасці: «знак бяды», «сцюжа», «вогненная яма» і інш. Антыўтапічная семантыка паказвае механіку духоўнага і фізічнага знішчэння і падаўлення асобы. Топас «зона» адлюстроўвае асноўныя сацыяльныя і духоўныя праблемы беларускага грамадства XX–XXI ст. Ён сфарміраваны як вынік Чарнобыльскай катастрофы ў творах Г. Вашчанкі («Зорка Палын», «Зона стронцыю»), С. Давідовіча («Зона»), М. Савіцкага (цыкл карцін «Чорная быль»). Зона – тэрыторыя адчужэння, забруджвання, смерці. «Казка жыцця» ператвараецца ў антыўтопію.

Сувязь ідэалу з рэальным сацыякультурным вопытам у беларускай культуры вельмі арганічная і жыццёвая. Нацыянальны ідэал «казка жыцця» мае не толькі вялікае эстэтычнае значэнне, але і выконвае важную сацыякультурную функцыю ў грамадстве. Ён уплывае на фарміраванне пазітыўных адносін да чалавечай экзістэнцыі, годнасці асобы і каштоўнасці зямнога жыцця. Духоўную каштоўнасць «замілаванне да жыцця» А. Швейцар ацэньваў як выратоўны сродак у сітуацыі татальнага крызісу культуры [1]. Выпрацаваныя народнай культурай ідэалы валодаюць вялікім педагагічным патэнцыялам, што неабходна ўлічваць пры фарміраванні ўсёй сістэмы адукацыі.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Швейцер, А.* Культура и этика / А. Швейцер. – М. : Прогресс, 1973. – 343 с.

УДК 130.2: 821.161.3

## ВЫЯЎЛЕННЕ «Я»-ЭКЗІСТЭНЦЫІ Ў МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ МЯЖЫ XX–XXI СТАГОДДЗЯ

*Т. М. Тарасава*
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь

*На матэрыяле твораў беларускіх пісьменнікаў Васіля Быкава, Віктара Казько, Юры Станкевіча аналізуюцца шляхі выяўлення «я»-экзістэнцыі ў мастацкай прозе мяжы XX–XXI стагоддзя. У айчыннай літаратуры ідзе інтэнсіўны пошук новых форм пазнання чалавека і свету: сфарміравалася ўстойлівая тэндэнцыя бачыць свет у шматграннасці ўсіх яго выяў, творам спецыяльна надаецца парадыйны характар, межы паміж рэальным і фантастычным часта бываюць размытыя.*

*Ключаваыя словы: праблема выбару, сітуацыя парога/мяжы, «я»-экзістэнцыя, экзістэнцыяльны абсурд.*

## IDENTIFICATION OF THE «I»-EXISTENCE IN PROSE OF THE TURN OF THE 20TH AND 21TH CENTURY

*T. M. Tarasova*
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus

*Ways to identify the «I» - existence in prose of the turn of the 20th and 21th century based on the material of Belarusian writers Vasil Bykov, Victor Kazko, Yuri Stankevich are analysed. There is an intensive search in national literature for new ways of viewing the world and the human being: a steady trend to see the world in diversity of all its images has been formed, works have specially been given the parody nature, the boundaries between the real and the fantastic are often blurred.*

*Key words: the problem of choice, the situation of the threshold/ boundary, the «I» - existence, existential absurd.*

Другая сусветная вайна надзвычай востра актуалізавала праблемы парога/мяжы, выбару, і «інтэлектуальная» проза завастрыла іх з усёй філасофскай глыбінёй. Гэтыя праблемы да маштабных філасофскіх праблем далучыў яшчэ Ф. Ніцшэ («Так говорил Заратустра», «Антихрист»). Нямецкі мысліцель змадэляваў сітуацыю «вялікага разрыву», пакінуўшы чалавека без Бога, без маралі, ведаў, ідэалогіі, у выніку чаго адбылася пераацэнка фактычна ўсіх каштоўнасцей, і свет у тым ліку застаўся без самога чалавека. Безумоўна, такая акалічнасць, калі «ўсё дазволена» і не варта «нічога баяцца»,